**Міхно, У.** Крутыя кіламетры Уладзіміра Бараноўскага / У. Міхно // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 2004. — 17 лют. — С. 2.

## КРУТЫЯ КІЛАМЕТРЫ УЛАДЗІМІРА БАРАНОЎСКАГА



*Статыстыка – рэч упартая і нешматслоўная. Яна гаворыць лічбамі. Мы ведаем: іх, воінаў-афганцаў, у раёне 102 чалавекі. Дзякуй Богу, яны пакуль не пакідаюць гэты свет так хутка, як пакідаюць яго ветэраны Вялікай Айчыннай. Не той узрост. «Афганцам» пакуль па сорак, ці крышачку меней, болей... І тым не менш... пяць захаванняў на Чашніччыне. Пяць цынкавых хлопчыкаў у зямлі і гранітных абеліскаў, да якіх кожны раз 15 лютага кладуцца жывыя кветні. Жывыя – ад жывых, мёртвым... У нашым раёне ў шасці сем'ях плачуць бацькі ад незабыўнага гора, не дачакаўшыся дзяцей сваіх з той вайны... Паклонімся магілам, паклонімся мацяркам! Зробім усё, што можам, для жывых. Летась шасцёра воінаў-інтэрнацыяналістаў атрымалі жыллё, сямёра прайшлі стацыянарнае лячэнне ў медыцынскіх установах раёна. Штогод нашы «афганцы» маюць права і магчымасць прайсці дэталёвае медыцынскае абследаванне, атрымаць пуцёўкі ў санаторыі і дамы адпачынку. Праўда, не заўсёды ім карыстаюцца. Што ж, яны не любяць выдзяляцца, бо і так ледзьве ўпісаліся ў наша мірнае жыццё пасля той далёкай і чужой вайны... Яны не прывыклі скардзіцца і ныць. Таму і маўчаць часцей.*

Ці лёгка быць вадзіцелем на такой машыне, якой усе саступаюць дарогу? На гэтае пытанне вам, напэўна ж, адкажа Уладзімір Эдуардавіч Бараноўскі. Не, ён працуе не на «хуткай дапамозе», ён у райвыканкаме вадзіцель. Толькі ж не падумайце, што выканкамаўскаму транспарту ўсюды на дарозе зялёная вуліца і што ездзіць ён з урадавымі «мігалкамі». Куды там, саступаць... Калі нават сірэна спецмашын іншым вадзіцелям не ўказ. А рыцары за рулём зараз, бадай, не трапляюцца. Што такое рыцарства, ведае Уладзімір па Афганістане, калі едзеш, ледзьве паўзеш, гружаны снарадамі. Ды не сорак штук іх загружаеш на свой «УРАЛ», а сто, каб не хадзіць паражняком. Альбо калі на «БМ-212» вязеш устаноўку «ГРАД» займаць баявую пазіцыю. Вось тады і расступаецца перад табою тэхніка. Як жа! Артылерыя – Бог вайны!

Малады, не на свае сорак гадоў, усмешлівы хлопец, Уладзімір, зрэшты, цалкам пазбаўлены пачуцця багемнасці. Просты, кампанейскі, таварыскі. Хаця... не такі, як многія яго равеснікі. Тыя – у бутэльку, ён – у лес на паляванне, у спартыўную залу, да валейбольнай сеткі. Аднойчы нават, калі толькі прыйшоў з Афганістана, паспрабавалі с сябрам купацца ў ледзяной вадзе, у палонцы. А што, у жыцці ўсяго трэба паспрабаваць!

Чаго яшчэ ён не ведае? Праз агонь прайшоў, праз ваду. Хіба толькі медныя трубы яго абмінулі ды куля свінцовая. Хаця Уладзімір ведае – зусім не абавязкова, каб мець баявыя ўзнагароды, пасвіць смерць на перадавой. Можна і пры штабе выседзець ордэн, і нават лягчэй. Ну, ды Бог з імі, з узнагародамі. Зусім не па іх хадзілі яны з хлопцамі на вайну, з землякамі, з двума Мішкамі: Нарчуком – з Ліпавіч, і з Гайдуком – з Дубавага Лога. З Мішкам Нарчуком служылі разам і

ў Шындандзе і ў Газні. А можна было і зусім не трапіць у Афган. Можна было застацца ў Віцебску, пры абласным ваенкамаце, прапаноўвалі. Можна было, урэшце, у Усцькаменагорску, адкуль пасля трохмесячнага «каранціну» і адправілі ў Афган, «закасіць». Ды што там «закасіць», калі якраз перад адпраўкаю на вайну ён, Бараноўскі, трапіў у цяжкую дарожную аварыю, моцна пакалечыўся, ляжаў у шпіталі. Лёс як бы пазначыў хлопца, даўшы яму надзею на жыццё. Нездарма ж кажуць, што снарад два разы ў адну і тую ж варонку не трапляе. Лёс перасцерагаў, а ён, Уладзімір, нават і не думаў асцерагацца. Якое там! Ім, васемнаццацігадовым пацанам, рамантыкі хацелася. Не паверыце, але тыя, каму «не пашанцавала» разам з ім ляцець у Афганістан... плакалі. Маладыя, наіўныя, дый пра вайну яшчэ няшмат ведалі.

... Афганскі аэрадром. Узлётная паласа. Спякота страшэнная. Вакол – «БУРы», «дэмбалі» ідуць насустрач, шчаслівыя. А яны – напярэймы, насустрач вайне і, магчыма, смерці. Шынданд, артылерыйская часць, спачатку каравулы, нарады, затым пачалі ездзіць па снарады на Кушку. А калі з Шынданда перавялі ў Газні, стала «весялей». Неяк занялі пазіцыі ў Пандшэрскай цясніне, захапілі варожы шпіталь, клады з боепрыпасамі. Пачаўся чарговы абстрэл. Тэхнікі шмат, падзецца няма куды, усе збіліся ў адзін бок. Ля машыны Бараноўскага стаяла «самаходка». Раптам залп – і яе няма, толькі праз дым бачыш, як выскачыў з машыны вадзіцель, ды чарговы слуп агню злізаў яго, як карова языком. Страшна чакаць сваёй смерці, ды, мабыць, яшчэ страшней бачыць, як паміраюць таварышы. А не баяцца смерці толькі дурні. Аднак, Бог пазначыў яго, Уладзіміра Бараноўскага, яшчэ ў Саюзе, ці не таму прайшоў ён праз афганскую вайну без аніводнае драпіны, а ў шпіталі быў толькі аднойчы, дый то з падазрэннем на жаўтуху, якое не пацвердзілася. Месяц патрымалі і адпусцілі, усё роўна там лякарстваў не было.

Два доўгія гады і два месяцы цягнуліся яго крутыя афганскія кіламетры да «дзембеля». А ўзнагародаю стаў доўгачаканы самалёт, які ў Кабуле хлопцы «лавілі», як таксі, дзевяць дзён. Першы не злавілі, на ім паляцеў нейкі генерал. Урэшце байцы паляцелі на другім, рассеўшыся на… бомбы. Няхай сабе яны ляцелі і на бомбах, але затое – з вайны.

А зараз усё тое – як даўні сон, цяжкі, кашмарны. Прачнуліся, ну, і дзякуй Богу, і ўспамінаць не хочацца. Зараз «афганцы» ўсё болей маўчаць. Іх маўчанне вельмі красамоўнае…

**У. Міхно**